ФОРУМ ТВОРЧАЙ І НАВУКОВАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ ДЗЯРЖАЎ – УДЗЕЛЬНІЦ СНД

ЦІКАВЫЯ ІДЭІ І ІНІЦЫЯТЫВЫ

Сёлета Беларусі ўпершыню выпаў гонар прымаць на сваёй гасцінная зямлі ўдзельнікаў форуму творчай і навуковай інтэлігенцыі, які праводзіцца штогод у адной з краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Сёлетні форум прайшоў ужо восьмы раз. У сувязі з абвяшчэннем 2013 года Годам экалагічнай культуры і аховы навакольнага асяроддзя ў СНД мерапрыемства ў значнай ступені было прысвечана экалагічнай тэматыцы, аднак цікавасць у шматлікіх замежных гасцей выклікалі і іншыя пытанні. Вынікі разам з карэспандэнтам БЕЛТА падводзіў старшыня Рады па гуманітарным супрацоўніцтве дзяржаў — удзельніц СНД, міністр інфармацыі Беларусі Алег Праляскоўскі.

— Алег Вітольдавіч, наколькі, на вашу думку, быў плённым форум, які прайшоў, ці задаволены вы асабіста яго арганізацыяй?

— Удзельнікі форуму прадэманстравалі высокі ўзровень прафесіяналізму, што вынікае з агучаных прапаноў і ініцыятыў у галіне культуры, адукацыі, навукі і інавацый, фізічнай культуры і спорту, турызму. Асаблівы інтарэс выклікала сярод удзельнікаў работа моладзевай секцыі. І, зразумела, у аснове форуму ляжалі пытанні экалагічнай культуры і аховы навакольнага асяроддзя. Ім надавалася асаблівая ўвага. Найбольш цікавыя і каштоўныя прапановы дэлегатаў знойдуць адлюстраванне ў выніковай рэзалюцыі форуму. Падрыхтаваны дакумент быў прыняты ўдзельнікамі з некаторымі папраўкамі. Справа ў тым, што ў ходзе абмеркавання ўзнікла неабходнасць дапрацаваць рэзалюцыю і ўнесці ў яе пэўныя карэктывы. Зноў жа, гэта звязана з актыўнай работай розных секцый. Дакумент будзе дапоўнены найбольш цікавымі прапановамі, пасля чаго з ім можна будзе азнаёміцца.

У цэлым магу сказаць, што VIII Форум творчай і навуковай інтэлігенцыі дзяржаў — удзельніц СНД быў арганізаваны на высокім узроўні. У яго працы ўзялі ўдзел каля 500 прадстаўнікоў краін Садружнасці, Балтыі і Грузіі, Выканаўчага камітэта СНД, Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД, органаў галіновага супрацоўніцтва СНД, ЕўрАзЭС, ЮНЕСКА, грамадскіх, адукацыйных, навуковых і творчых арганізацый. На адрас форуму паступілі прывітанні кіраўнікоў дзяржаў Садружнасці — Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Расіі, Таджыкістана, Туркменістана.

Акрамя работы тэматычных секцый, дэлегаты розных краін атрымалі магчымасць узяць удзел у каардынацыйнай нарадзе кіраўнікоў органаў галіновага супрацоўніцтва СНД гуманітарнай сферы, пасяджэнні Рады Еўразійскай асацыяцыі ўніверсітэтаў, Рады рэктараў нацыянальных кансерваторый дзяржаў — удзельніц СНД, сумесным пасяджэнні Рады па гуманітарным супрацоўніцтве дзяржаў — удзельніц СНД і праўлення Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва.

— Ці не маглі б вы назваць самыя, на ваш погляд, цікавыя і каштоўныя прапановы, агучаныя ў ходзе форуму?

— Складана ўспомніць іх усе, таму што прапаноў было агучана сапраўды шмат. Прадстаўнікі творчай і навуковай інтэлігенцыі вельмі адказна падышлі да работы. Напрыклад, удзельнікаў форуму парадаваў праект «100 ідэй для Беларусі», і не выключана нават, што на прасторы Садружнасці ён атрымае новую назву — «100 ідэй для СНД». Паступіла прапанова прызначыць у 2014-м у СНД не толькі культурную, але і моладзевую сталіцу. Рэктар МДУ імя М.В. Ламаносава акадэмік Віктар Садоўнічы прапанаваў арганізаваць у рамках Садружнасці навуковы клуб. Дарэчы, у заключнай рэзалюцыі мы абазначылі гэту ініцыятыву і прапанавалі МДУ распрацаваць праект канцэпцыі дзейнасці клуба і прадставіць навуковы даклад па актуальных пытаннях для абмеркавання на чарговым форуме.

Таксама была агучана ініцыятыва аб стварэнні ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў банка звестак інавацыйных ідэй моладзі. Не засталася без увагі і сфера турызму: хоць на 2014 год у краінах СНД намечана правядзенне больш за паўсотні сумесных мерапрыемстваў, была выказана думка аб неабходнасці атрымання больш дэталёвай інфармацыі аб турыстычных магчымасцях розных краін, аб арганізацыі большай колькасці мерапрыемстваў па прасоўванні турыстычных паслуг. Найбольш цікавыя праекты па развіцці турызму гатовы падтрымаць Міждзяржаўны фонд гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД. У сувязі з гэтым у заключнай рэзалюцыі мы абазначылі важнасць правядзення ў 2014 годзе II Міжнароднай канферэнцыі па супрацоўніцтве і фарміраванні ўзгодненай палітыкі ў пытаннях развіцця культурна-пазнавальнага турызму ў рамках СНД. Удзельнікі форуму таксама падтрымалі магчымае прыняцце сёлета Стратэгіі развіцця супрацоўніцтва ў галіне турызму на перыяд да 2020 года.

Акрамя таго, выказвалася думка аб важнасці прыцягнення цэнтральных тэлеканалаў кожнай з краін Садружнасці да больш актыўнага асвятлення мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў рамках СНД. Спецыяльны прадстаўнік прэзідэнта Расіі па міжнародным культурным супрацоўніцтве Міхаіл Швыдкой, напрыклад, лічыць, што неабходна шукаць і ствараць больш пазітыўных інфармацыйных падстаў для сродкаў масавай інфармацыі. Гэта дапаможа перабіць негатыўныя інфармацыйныя плыні, якія перыядычна ўзнікаюць паміж нашымі краінамі, бо, як вядома, на прасторы СНД не можа быць ізаляванага інфармацыйнага суправаджэння. Да таго ж агульных інтарэсаў у гуманітарнай сферы ў нас дастаткова. Галоўнае — заўважаць важныя інфармацыйныя падставы і акцэнтаваць на іх увагу прэсы, зацікаўліваць яе ў асвятленні мерапрыемстваў, якія праводзяцца на ўзроўні Садружнасці. Гэта датычыцца не толькі міжнароднай тэлерадыёкампаніі «Мір», але і СМІ нацыянальнага значэння, і асабліва тэлеканалаў, колькасць аўдыторыі якіх вельмі вялікая.

— Лейтматывам гэтага мерапрыемства стала экалагічная тэматыка, але, як вы адзначылі, абмяркоўваліся і многія іншыя пытанні. Якія канкрэтна рашэнні знайшлі адлюстраванне ў заключнай рэзалюцыі?

— Удзельнікі форуму творчай і навуковай інтэлігенцыі маюць намер садзейнічаць найхутчэйшаму стварэнню Міждзяржаўнай экалагічнай рады. Да экспертнай працы пры стварэнні такой рады плануецца далучаць прадстаўнікоў Грузіі і краін Балтыі. Гэта дапаможа вырашаць задачы міждзяржаўнага характару, накіраваныя на захаванне біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці на прасторы Садружнасці.

Плануецца ўдасканальваць якасць экалагічнай адукацыі, падтрымліваць фарміраванне міжнародных калектываў для сумеснай навукова-даследчай дзейнасці ў галіне экалогіі і прыродакарыстання, аказваць падтрымку пры арганізацыі міжнародных адукацыйных праектаў у галіне экалогіі, экалагічнага і аграрнага турызму.

Атрымаюць развіццё праекты, накіраваныя на фарміраванне станоўчага іміджу дзяржаў — удзельніц СНД, а таксама праекты па распаўсюджванні рускамоўных выданняў (у тым ліку электронных) для навуковых і адукацыйных арганізацый, нацыянальных і ўніверсітэцкіх бібліятэк краін Садружнасці, Балтыі і Грузіі, уключаючы выдавецкі праект серыі кніг «Сугучнасць сэрцаў». Прафесіянальны медыясферы краін Садружнасці працягнуць браць удзел у маштабным медыяфоруме «Партнёрства ў імя будучыні», які штогод праходзіць у Мінску. У 2013—2014 гадах будзе актуальнай практыка гастрольна-адукацыйных тураў Моладзевага сімфанічнага аркестра СНД.

Актывізуецца валанцёрская работа моладзі краін Садружнасці ў сумесных экалагічных праектах, на зімовых Алімпійскіх гульнях у Сочы-2014, у праекце «Вахта Памяці», прысвечаным святкаванню 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. У 2014—2015 гадах будзе па-ранейшаму рэалізоўвацца міждзяржаўная праграма «Культурныя сталіцы Садружнасці», але ўжо з улікам Года турызму ў СНД, які чакаецца, і святкавання 70-годдзя Перамогі народаў краін Садружнасці ў Вялікай Айчыннай вайне.

Гэта далёка не ўсе рашэнні, абазначаныя ў заключнай рэзалюцыі форуму навуковай і творчай інтэлігенцыі. Больш за тое, як я ўжо сказаў раней, дакумент будзе значна пашыраны і дапоўнены новымі пунктамі, якія ўяўляюць вялікі інтарэс для дзяржаў — удзельніц СНД і будуць спрыяць больш інтэнсіўнаму развіццю гуманітарнай сферы.

— У ходзе форуму была выказана думка, што IX Форум творчай і навуковай інтэлігенцыі будзе арганізаваны ў Кіеве, а дзясяты, юбілейны, можа прайсці ў Маскве, з якой, уласна, усё і пачыналася...

— Сапраўды, гаворка пра гэта ішла з улікам запланаванага старшынства Украіны ў СНД у 2014 годзе. Цяпер украінскі бок прапрацоўвае пытанне аб правядзенні IX Форуму творчай і навуковай інтэлігенцыі дзяржаў — удзельніц СНД у Кіеве ўвосень 2014 года. Так што такая верагоднасць не выключаецца. Пра Маскву ж цяпер гаварыць рана, пакуль гэтая прапанова ў большай ступені мае рэкамендацыйны характар з боку Міхаіла Швыдкога як сустаршыні Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва краін — удзельніц СНД.

Беларусь жа, у сваю чаргу, заўсёды гатова прымаць падобнага кшталту мерапрыемствы і садзейнічаць больш дынамічнаму развіццю гуманітарнай сферы на прасторы Садружнасці, тым больш што нашы ганаровыя госці вельмі высока ацанілі ўзровень падрыхтоўкі форуму, які прайшоў у Мінску. Яны выказалі ўдзячнасць Прэзідэнту Беларусі за цёплы прыём на беларускай зямлі, за аказаную ўвагу і гасціннасць і высока ацанілі ўзровень арганізацыі культурна-пазнавальных і прэзентацыйных мерапрыемстваў.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

«ГАРАНТУЮЦЬ» ПАД 45%

Найбуйнейшы камерцыйны банк Беларусі ўстанаўлівае з учарашняга дня больш высокую стаўку па новых банкаўскіх укладах у айчыннай валюце «Гарантаваны даход», паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Беларусбанка. Цяпер па гэтым дэпазіце на 35 дзён кліентам банка прапануюць атрымаць даход у памеры 45% гадавых.

Сяргей ПАЛІНІН.

У КАСТРЫЧНІКУ БАЗАВАЯ — 130 ТЫСЯЧ

Згодна з пастановай Саўміна № 842, з першых дзён кастрычніка базавая велічыня ў нашай краіне павялічваецца на 30 тысяч і складзе 130 тысяч рублёў. Апошні раз базавую велічыню павялічвалі летась у красавіку. Тады яна ўзрасла з 35 000 да 100 тысяч рублёў.

Сяргей КУРКАЧ.

ДОБРААХВОТНАЯ ЗДАЧА ЗБРОІ

З 30 верасня па 4 кастрычніка ў Мінску будзе праводзіцца аператыўна-прафілактычнае спецыяльнае комплекснае мерапрыемства «Арсенал» па добраахвотнай здачы зброі і боепрыпасаў.

Пры добраахвотнай здачы зброі і боепрыпасаў у органы ўнутраных спраў размова не ідзе пра адміністрацыйнае або крымінальнае пакаранне, нагадвае старшы інспектар па дазвольнай рабоце аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі УУС адміністрацыі Першамайскага раёна г. Мінска Юрый СІЛІВОНЧЫК. Звяртацца можна на адрасе вул. Бялінскага, 10, атрымаць дадатковую інфармацыю — па нумарах: 280 97 31, 280 02 02, 280 24 42.

Святлана БАРЫСЕНКА.

НОВЫ СПАРТЫЎНЫ ТЭЛЕКАНАЛ ЗАПУСЦЯЦЬ У ЛІСТАПАДЗЕ

Паглядзець «Беларусь 5» можна будзе ўжо з 1 кастрычніка — але толькі ў сценах Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі. Прыкладна праз месяц, пасля наладкі тэхнікі і візуальнага афармлення тэлеканала, а таксама навучання тэхнічнага персаналу спартыўная «кнопка» праз кабельных аператараў прыйдзе і да звычайных гледачоў.

«Асноўнымі фарматамі на канале будуць прамыя трансляцыі спартыўных спаборніцтваў, навіны спорту і аналітыка. Прыярытэтам жа «Беларусь 5» стане выкарыстанне эксклюзіўнага кантэнту», — падкрэсліваюць на канале.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

СТРАЛЯЎ ПА ЛЮДЗЯХ, КАБ ВЫПРАБАВАЦЬ ПІСТАЛЕТ

Завершана расследаванне крымінальнай справы ў дачыненні да мужчыны, які 22 чэрвеня траўмаваў трох людзей на прыпынку грамадскага транспарту ў Мінску.

Дзеянні 29-гадовага «стралка» кваліфікаваны як асабліва злоснае хуліганства. Паводле слоў афіцыйнага прадстаўніка Следчага камітэта Беларусі Юліі Ганчаровай, у момант здзяйснення злачынства ён быў нападпітку. Калі казаць пра матывы, то сам абвінавачаны сцвярджае, што яму захацелася выпрабаваць працаздольнасць набытага напярэдадні пнеўматычнага пісталета. Следства адзначае, што мужчына страляў па людзях свядома і дапускаў, што можа нанесці ім цялесныя пашкоджанні.

Як высветлілася, «стралок» мае дзве судзімасці за разбой і рабаванне, нідзе не працуе. Яго характарызуюць як чалавека, які супрацьпастаўляе сябе грамадству, грэбуе нормамі маралі. Зараз абвінавачаны знаходзіцца пад вартай.

Нагадаем, што 22 чэрвеня сярод белага дня з легкавой машыны абстралялі прыпынак грамадскага транспарту на Партызанскім праспекце Мінска. Малады чалавек і дзве дзяўчыны, якія ў гэты момант знаходзіліся на прыпынку, атрымалі раненні і былі шпіталізаваны. Аўтамабіль з падазраванымі з месца здарэння знік. Неўзабаве яго знайшлі на тэрыторыі Мінска і затрымалі чатырох маладых людзей, якія знаходзіліся ў салоне.

Надзея ПАЎЛАВА.

ЛЕТА ЯСНАЕ «ПРАСПАЛІ»...

З пачаткам навучальнага года ў сярэдняй школе № 8 па вуліцы Васілька ў Гродне... працякае дах.

Гэты факт быў агучаны на пасяджэнні калегіі Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці па выніках маніторынгу падрыхтоўкі да асенне-зімовага перыяду. Так бы мовіць, лета яснае «праспалі», а калі нарэшце пачалі рамантаваць дах... У выніку зацякання вады пасля дажджоў у памяшканнях на верхніх паверхах будынка пашкоджаны шпалеры на сценах, столь, паркет у актавай зале. Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці Васіль Герасімаў даручыў разабрацца, чаму неабходныя работы не выканалі да 1 верасня, і пакараць вінаўных. І каб не атрымалася так, што грошы на навядзенне парадку ў памяшканнях будуць збіраць з бацькоў школьнікаў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

АБУЦЬ МОГ ЦЭЛУЮ ВЁСКУ

Больш як 260 пар абутку коштам каля 44 мільёнаў рублёў канфіскавалі ў мінскага прадпрымальніка. Аўто «Мерседэс-Бенц», якім ён кіраваў, супрацоўнікі ДАІ затрымалі раніцай на аўтадарозе Брэст—Мінск—мяжа РФ. Неабходныя кантрольныя знакі на тавары адсутнічалі. У дачыненні да бізнесмена складзены адміністрацыйны пратакол.

БЕНЗІН ЗАМЕСТ ДРОЎ

У вёсцы Стасева Лёзненскага раёна адбыўся пажар у жылым доме з-за таго, што гаспадар спрабаваў распаліць печ у кухні бензінам.

— Аб пажары ў службу выратавання паведамілі каля дзевяці гадзін раніцы. І ўжо праз дзве хвіліны на месца здарэння прыбыло падраздзяленне пажарнага аварыйна-выратавальнага паста, размешчанага ў гэтым жа населеным пункце. Гаспадар дома, пенсіянер, знаходзіўся на вуліцы, а ўнутры ахопленага агнём будынка былі яго жонка і цешча, 1929 года нараджэння, — расказала Марына Фандо, прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ДЗІЎНЫ СВЕТ ЧЭСЛАВА НЕМЭНА

У нядзелю 29 верасня ў Шчучынскім раёне ладзяць свята музыкі імя свайго земляка Чэслава Немэна «Гэты дзіўны свет».

Свята распачнецца ў вёсцы Старыя Васілішкі з экскурсіі ў клубе-музеі Чэслава Немэна і выступлення ансамбля польскай песні «Крэсовяцы» (г. Ліда), а прадоўжыцца ў аграгарадку Васілішкі. Памяці знакамітага музыканта будуць прысвечаны фотавыстава «Чэслаў Немэн. Вяртанне...», дэманстрацыя дакументальнага фільма «Гэты дзіўны свет», канцэрт самадзейных артыстаў. Акрамя таго, у праграме свята — выстава-продаж яблыкаў, «Горад майстроў». Дарэчы, толькі сёлета ў вёсачцы Старыя Васілішкі, на радзіме Чэслава Немэна, паводле слоў загадчыка клуба-музея Уладзіміра Сянюты, пабывала каля 1,5 тысячы турыстаў. Прыязджалі госці не толькі з Беларусі, але і з іншых краін былога СССР, а таксама з Польшчы, Літвы, Галандыі, Францыі, Ізраіля, Швецыі, ЗША.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

«БРОНЗА» — ЗА НАВУКІ АБ ЗЯМЛІ

Бронзавыя медалі заваявалі беларускія школьнікі на 7-й міжнароднай алімпіядзе навук аб Зямлі, што праходзіла ў Індыі.

Зборную каманду нашай краіны прадстаўлялі васьмікласнік сталічнай гімназіі № 22 Арцём Зубрыцкі, дзесяцікласніца гімназіі № 33 Мінска Ангеліна Кхацівада, вучань 10-га класа магілёўскай гімназіі № 4 Глеб Лазовік і дзевяцікласнік гімназіі № 1 г. Жодзіна Уладзіслаў Дагліс.

Беларусам давялося спаборнічаць у Індыі з равеснікамі з 27 краін. Ад удзельнікаў патрабавалася прадэманстраваць сваё веданне астраноміі, атмасферы, гідрасферы і геасферы. Усе раздзелы ўключалі як тэарэтычныя пытанні, так і практычныя заданні. Прычым для іх выканання патрэбна было веданне англійскай мовы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Курсавая розніца

СЛОВЫ ТАКСАМА МАЮЦЬ КОШТ...

Ну гэта проста смешна ўжо. Вы ўяўляеце сабе: у ЗША чарговы дэфолт. Не, пакуль не адбыўся. Пра яго толькі гавораць. Але ж «словы», як ні дзіўна, вызначальны фактар валютнага рынку.

Хоць не ўсім словам цяпер вераць. Напрыклад, казка пра тое, што 17 кастрычніка ў Амерыцы будзе дэфолт (грошы ў бюджэце скончацца), якую расказаў міністр фінансаў ЗША Джэйкаб Лью ў чацвер, нікога, як мне здалося, не праняла. У 2011 годзе ўжо назіралі мы за экшэнам пад назвай «Абама ўгаворвае Кангрэс», калі апошні, хоць і супраціўляўся, але падняў як міленькі верхні парог запазычанняў. Дык вось, калі ў той час свет з хваляваннем назіраў за падзеямі і нервова то кідаўся ўбок ад долара, то зноў за ім ганяўся, цяпер (на дзіва) амаль ніякай глабальнай рэакцыі не адбылося. Мне здаецца, што проста ўсе разумеюць: так ці інакш Злучаныя Штаты і ў гэты раз выкруцяцца. А таму не бачыць ніхто сэнсу ў распродажы долара — падаць ён, відаць, не будзе. Нечакана адрэагаваў на заяву амерыканскага міністра амаль што толькі расійскі фондавы і валютны рынак. Рубель пачаў падаць. Іншая сітуацыя ў Еўропе. Нямецкай эканомікай зноў будзе кіраваць Ангела Меркель, што стала вядома пасля нядаўніх парламенцкіх выбараў. А гэтую спадарыню многія лічаць занадта кансерватыўнай — значыць, асаблівых рэформаў можна не чакаць і развіццё эканомікі будзе ісці па ранейшым шляху. Гэта можа справакаваць пасіўнасць інвестараў у дачыненні да еўра.

Аднак я падкрэсліваю, што ўсё гэта толькі верагодныя кірункі развіцця падзей, а ўсё можа пайсці і па іншым сцэнары, калі адбудзецца нешта нечаканае.

У Беларусі ж пакуль такая карціна. Долар за тыдзень падаражэў на 50 рублёў (плюс 0,6%) да 9080. Еўра таксама падняўся — на 30 рублёў (плюс 0,3%) да 12250. Расійскі рубель патаннеў на 4 грашовыя адзінкі (мінус 1,4%) і цяпер каштуе 280,5.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

БЕЛАРУСБАНК

Публичная оферта (предложение) о начислении поощрительного процентного дохода по срочным банковским вкладам в белорусских рублях

1. ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает с 27 сентября 2013 года начисление поощрительного процентного дохода по следующим срочным банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях:
- **«Сберегательный» –** в размере **18%** годовых;
- **«Ваш выбор»** (вне зависимости от ежедневного остатка вклада) **–** в размере **17%** годовых;
- **«Премиально-накопительный «Детский» –** в размере **16,5%** годовых;
- **«Классик плюс» –** в размере **14,7%** годовых**,**
- **Накопительный –** в размере **13**% годовых.

Начисление поощрительного процентного дохода производится на ежедневные фактические остатки указанных видов вкладов за период с 27.09.2013 или дня открытия вклада (депозита) после указанной даты по 29.10.2013 (включительно).

Присоединение к остатку вклада поощрительного процентного дохода производится 30.10.2013.

При этом поощрительный процентный доход не выплачивается:
- в случае если в период с 27.09.2013 по 29.10.2013 (включительно) совершается возврат вкладчику суммы вклада (в том числе вкладов, срок возврата которых наступил в указанный период 2013 г.) или расходная операция, влекущая перерасчет причитающегося по вкладу дохода, или первая расходная операция на основании свидетельства о праве на наследство;
- в случае если на 27.09.2013 по вкладу начисляется пониженная процентная ставка или доход по вкладу начисляется в размере ставки вклада до востребования (в том числе по вкладам «Сберегательный» и «Классик плюс», срок возврата которых наступил до 27.09.2013).

Начисление дохода на сумму поощрительного процентного дохода производится с 30.10.2013.

2. Акцептом публичной оферты (предложения), указанной в пункте 1, является получение вкладчиком поощрительного процентного дохода.

*ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает с 27 сентября 2013 года процентную ставку в размере **45%** годовых по вновь принимаемым срочным банковским вкладам в белорусских рублях «**Гарантированный доход**» на 35 дней (по ранее принятым вкладам, установленный размер процентной ставки применяется с даты автоматического перезаключения на новый срок, начиная с 27.09.2013).*

Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка»

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.
Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов)

ЦІ БЫЦЬ МАГІЛЁВУ ГЕРОЕМ?

Магілёўскія ветэраны звярнуліся да ўлад з новым хадайніцтвам аб прысваенні абласному цэнтру ганаровага звання «горад-герой», якое прапануюць заснаваць на ўзроўні СНД.

Фота БЕЛТА.

Старшыня Савета абласной ветэранскай арганізацыі Анатоль Любчанка паведаміў, што Магілёўскі аблвыканкам падтрымлівае просьбу ветэранаў аднавіць гістарычную справядлівасць і прызнаць заслугі Магілёва.

— Няма ніводнага такога горада ў Беларусі, дзе б трымалі абарону 23 дні і ночы, — кажа Анатоль Любчанка, — і дзе б такі вялікі ўдзел у стрымліванні ворага брала грамадзянскае насельніцтва: штодня дзясяткі тысяч чалавек выходзілі, каб будаваць умацаванні. Пакуль яшчэ жывыя нашы ветэраны вайны, трэба зрабіць Магілёў горадам-героем.

З такой просьбай ветэраны Магілёўшчыны звяртаюцца да ўлад не першы раз. «Так, рабілі гэта неаднойчы, але нас, на жаль, не пачулі», — прызнае лідар ветэранаў Магілёўшчыны. Цяпер робіцца новая спроба, бо такі цалкам заслужаны статус абласнога цэнтра, мяркуюць у рэгіёне, быў бы самым лепшым падарункам да дзвюх юбілейных дат — вызвалення Беларусі (у 2014 г.) і Перамогі (у 2015 г.).

У ветэранскай арганізацыі спадзяюцца, што Магілёўскі аблвыканкам, паводле іх хадайніцтва, звернецца ў выканаўчы камітэт СНД, каб заклікаць краіны Садружнасці, якія рыхтуюцца адзначыць 70-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, абмеркаваць пытанне аб заснаванні звання «горад-герой» на сваім узроўні. Прычым гэта можа датычыцца не толькі Магілёва, але ўсіх гарадоў, якія ўнеслі значны ўклад у гераічную абарону ад фашысцкіх захопнікаў, але іх заслугі не былі адзначаны.

Між тым, барацьба за званне «горада-героя» ёсць не адзіны клопат напярэдадні вялікай даты. Сёння ў Магілёўскай вобласці жыве 3400 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. З іх амаль 2,5 тысячы — яе непасрэдныя ўдзельнікі. Галоўная задача — каб ніхто з іх не быў забыты.

Таму ў Магілёўскай вобласці хутка стартуе **дабрачынная акцыя «З любоўю да ветэранаў»,** паведаміў журналістам **начальнік Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі аблвыканкама Анатоль Сінкавец.** У яе межах мяркуецца праводзіць розныя мерапрыемствы (канцэрты, творчыя вечарыны, сустрэчы), а зробленыя на іх сродкі пералічваць на рахунак мясцовых ветэранскіх арганізацый. Да акцыі мяркуюць далучыцца работнікі не толькі сферы культуры, але таксама аховы здароўя, сацыяльных службаў, адукацыі, спорту і турызму.

Аднак канцэртамі справа не абмяжуецца: адбудзецца вывучэнне сацыяльна-бытавых умоў жыцця ветэранаў вайны (дарэчы, у Магілёўскай вобласці няма чаргі на паляпшэнне жыллёвых умоў ветэранаў), пройдуць комплексныя медыцынскія агляды.

Гэтымі днямі ва ўсходніх сельскіх раёнах Магілёўскай вобласці пачалі адзначаць 70-гадовы юбілей вызвалення ад фашысцкіх захопнікаў. Святочныя мерапрыемствы праходзяць у райцэнтрах, а 12 лістапада ў Крычаве адбудзецца вялікае свята з удзелам дэлегацый з памежных расійскіх рэгіёнаў.

Ілона ІВАНОВА.

■ Рэйтынг

САМАЯ ДАРАГАЯ ВУЛІЦА МІНСКА — ПІЯНЕРСКАЯ

Самай дарагой жылой вуліцай Мінска названа Піянерская, кошт прапанавання 1 кв.м жылля на ёй перавышае $3,5 тыс. Аб гэтым паведаміла БЕЛТА намеснік дырэктара па продажах на другасным рынку жылля аднаго з буйнейшых сталічных агенцтваў нерухомай маёмасці Святлана КУДЗЕЛКА, спецыялісты якога падрыхтавалі і склалі рэйтынг 30 самых дарагіх жылых вуліц Мінска.

Высокія цэны на жылую нерухомую маёмасць у асноўным характэрны для цэнтра горада. У пяцёрку самых дарагіх трапілі вуліцы Карла Маркса ($3180 за 1 кв.м), Камуністычная ($3136), Інтэрнацыянальная ($3023) і Старажоўская ($3005). Разам з тым вуліца Піянерская, якая ўзначаліла рэйтынг, размешчана ў мікрараёне Дразды насупраць культурна-спартыўнага комплексу «Мінск-Арэна».

Намеснік дырэктара адзначыла, што кошт квадратнага метра на самых рэспектабельных вуліцах сталіцы амаль у два разы вышэйшы, чым у сярэднім па горадзе. Прычым цэны на жыллё ў цэнтры Мінска або паблізу маляўнічых мясцін павялічваюцца на працягу ўсяго года. «Такія кватэры набываюць у асноўным заможныя замежныя грамадзяне і ўнутраныя інвестары для далейшай здачы ў арэнду па высокіх стаўках», — растлумачыла яна.

Гаворачы аб месцы размяшчэння ў Мінску элітнага жылля, эксперт вылучыла пяць асноўных рэгіёнаў сталіцы. Па-першае, традыцыйна папулярнай з'яўляецца нерухомая маёмасць у гістарычным цэнтры горада, у тым ліку кватэры на вуліцах Інтэрнацыянальная, Леніна і Карла Маркса. У якасці альтэрнатывы выступаюць новыя элітныя раёны ў акваторыі ракі Свіслач (вуліцы Піянерская, Язміна-вая, Парніковая і Ваньковіча). Па-трэцяе, заможныя пакупнікі прыглядаюцца да кварталаў з папулярнасцю, якая крыху спадае, — вуліц Захарава і Пуліхава. З'яўленне там новабудоўляў дае магчымасць захаваць да раёна высокі інтарэс. Стабільным застаецца попыт на дамы па праспекце Незалежнасці.

Прычым цэнавы дыяпазон кватэр у розных дамах уздоўж праспекта значна адрозніваецца. Сваю нішу заняла і элітная забудова ў спальных раёнах горада — перш за ўсё сучасныя пабудовы ва Ураччы і ў раёне праспекта Дзяржынскага.

Считать недействительными страховые полисы ЗАО «СК «Белросстрах»:
- добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ №№ 1086806, 0996653, 1023087, 1069328, 1069444, 1092582, 1110687, 1117875, 1014877, 1057963, 1067077, 1146293, 1106353, 1159214, 1159215, 1177078, 1177091-1177092, 1203798;
- добровольное страхование ответственности перевозчика Ф.2РП сер. БИ № 0000252;
- квитанции 1 СУ серия КС №№ 0286037, 0919284, 3473142, 0918374, 0921998. УНП 100782388.

08 октября 2013 г. в 10.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестский КСМ».

Повестка дня:

1. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Брестский КСМ»: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.
Время регистрации в день проведения собрания с 10.00 до 10.30.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 02.10.2013 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 200295903 Совет директоров.

■ Факт

ЯШЧЭ АДЗІН ГІПЕРМАРКЕТ

Будаўніцтва гіпермаркета «Карона» пачнецца ў кастрычніку насупраць аўтацэнтра «АўтаВАЗ», у раёне перасячэння вуліц Каржанеўскага і Кіжаватава. Пра гэта паведаміў намеснік кіраўніка адміністрацыі Кастрычніцкага раёна сталіцы Дзяніс Жыбуль.

На сайце адміністрацыі Кастрычніцкага раёна ўдакладняецца, што інвестыцыйны дагавор па будучым аб'екце быў заключаны 22 снежня 2011 года. Агульная плошча гандлёвага цэнтра складзе каля 10 тысяч квадратных метраў, з іх гандлёвая плошча — не менш за 5 тысяч «квадратаў». Плануецца, што ў снежні 2014 года гіпермаркет будзе ўведзены ў эксплуатацыю.

Сяргей КУРКАЧ